This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2020.pp.347-361

Przegląd Środkowo-Wschodni, 5, 2020
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20200510

Data przesłania: 30.10.2019
Data akceptacji: 29.11.2019

**Вячаслаў Швед**
Uniwersytet Warszawski
v.shved@uw.edu.pl
ORCID: 0000-0002-2878-6231

# Варшаўскі перыяд жыцця Я. Ф. Карскага і лёс яго бібліятэкі

**Okres warszawski życia profesora J. F. Karskiego i los jego biblioteki**

W artykule analizuje się warszawski okres życia profesora J. Karskiego: jego działalność dydaktyczna, naukowa i społeczna. Autor bada także los biblioteki J.F. Karskiego, która została przekazana do depozytu Biblioteki Uniwersytetu Warszawskiego, a następnie przeniesiona do Mińska i włączona do księgozbioru Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego. Autor wyraża pogląd, że katalog biblioteki uczonego został stworzony w czasie pobytu w Warszawie. Część tego katalogu zaginęła podczas okupacji niemieckiej (1915–1918).

Słowa kluczowe: biblioteka warszawska, depozyt BUW, Białoruski Uniwersytet Państwowy, katalog, autografy autorów.

Нацыянальныя героі, асобы, маючыя значны ўплыў на выхаванне самасвядомасці беларусаў яшчэ не дастаткова асвечаны ў гістарыяграфіі Беларусі і яе суседзяў. Гэта толькі здаецца, што пра Яўхіма Фёдаравіча Карскага ўжо многа напісана, але архіўныя знаходкі даюць магчымасць пашырыць і паглыбіць ужо вядомае і дадаць новае пра яго жыццё і дзейнасць, раскрыць старонкі яго навуковай майстэрні. Дадзеная праца напісана не толькі на падставе

вядомых фактаў, але і новых, выяўленых у Дзяржаўным архіве сталічнага горада Варшава, Архіве бібліятэкі Варшаўскага універсітэта, матэрыялах аддзела рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

## 1. Варшаўскі перыяд жыцця і дзейнасці (1893–1915):

17 верасня 1891 г. Я. Ф. Карскі паспяхова здаў экзамен пры Гістарычна-філалагічным факультэце на ступень магістра рускай славеснасці. Тады ж падаў прашэнне на імя рэктара Варшаўскага універсітэта на заняцце пасады лектара рускай мовы. У спаборніцтве з магістрам Я.Ф. Будэ (будучым вядомым славістам і мовазнаўцам) ён выйграў, чаму садзейнічала і яго паходжанне. У заключэнні конкурснай камісіі было напісана: “Карскі больш знаёмы з заходнім краем і тут можа знайсці матэрыял для далейшых навуковых прац па вывучэнню старой заходне-рускай мовы і сучасных заходне-рускіх гаворак”[1].

28 кастрычніка 1893 г. Я.Ф. Карскі абараніў магістэрскую дысертацыю па спецыяльнасці руская мова і славеснасць у Кіеўскім універсітэце св. Уладзіміра, а ўжо 26 чэрвеня 1894 г. ён быў прызначаны на пасаду экстраардынарнага прафесара на Кафедры рускай і царкоўнаславянскай моў і гісторыі рускай літаратуры. У другім паўгоддзі 1894/95 навучальнага года Я. Ф. Карскі чытаў лекцыі па рускай мове для філолагаў, матэматыкаў, юрыстаў і медыкаў; граматыку царкоўнаславянскай мовы. У снежні 1896 г. на пасяджэнні навуковай рады Маскоўскага універсітэта Я. Карскі абараніў доктарскую дысертацыю *Заходне-рускія пераклады Псалтыраў XV–XVII стагоддзях.* Праз два месяца (27 сакавіка 1897 г.) яго перавялі ў ардынарныя (штатныя) прафесары. У 1897–1902 гг. Я. Карскі чытаў гісторыю расійскай мовы, народную рускую сла-

[1] Archiwum Państwowy M. St. Warszawy, z. 645, k. 7, 10 адв.; А.П. Цыхун. *Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф. Карскі,* Гродна1992, с. 23.

веснасць, царкоўнаславянскую мову, рускую дыалекталогію, славянскую кірылічную палеаграфію[2]. 23 снежня 1902 г. быў зацверджаны дэканам Гістарычна-філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта (да 22 верасня 1901 г.). Рада Варшаўскага універсітэта выбрала Я. Ф. Карскага рэктарам (34 галасы "за", 19 "супраць")[3]. Ён стаў першым абраным, а не прызначаным зверху рэктарам.

Пра рэктара Я. Карскага піша яго праўнук Аляксандр Аляксандравіч Карскі, абапіраючыся на матэрыялы *Варшавских Университетских Вестей; Варшавского дневника; Записок Общества истории, филологии и права при Imператарском Варшавском университете;* а таксама некаторыя архіўныя справы. Аўтар сцвярджае, што пачатак рэктарства яго прадзеда прыпаў на перыяд, калі Варшаўскі універітэт быў зачынены (20 кастрычніка 1905 г.) на тры з паловай гады ў сувязі з першай расійскай рэвалюцыяй. Рускія студэнты жадалі пакінуць універсітэт, а польскія выступалі за яго аўтаномію, паланізацыю, за права стварэння студэнцкіх аб'яднанняў. У гэтыя часы Я. Карскі нават думаў пакінуць універсітэт – яму прапаноўвалі пасады ў Нежынскім інстытуце і Маскоўскім універсітэце. Рада прафесараў Варшаўскага універсітэта пакуль у адстаўку не падавала настойваючы на пераводзе ВНУ ў які-небудзь буйны расійскі горад. Карскі скарыстаўся перапынкам у працы і разам з жонкай Саф'яй і дзецьмі Яўгенам, Сяргеям і Наталляй выехаў за мяжу. Пашпарт, які захаваўся, падае нам наступныя даты: перасёк дзяржаўную мяжу праз заставу Аляксандрава 3 чэрвеня 1906 г., вяртануўся праз заставу Грачыцы 2 ліпеня 1906 г.[4]

З пачатку 1908 г. у акадэмічных асяроддзі абмяркоўвалася пытанне магчымага адкрыцця Варшаўскага універсітэта з новага

[2] А.А. Карский, *Академик Карский* [у:] "Нёман" 2013, № 3, с.127–130.

[3] Archiwum Państwowy (далей AP) M. St. Warszawy, z. 645, k. 169; А.М. Решетов, *Евфимий Фёдорович Карский* [в:] *Курьер Петровской Кунсткамеры,Вып. 4–5*, СПб. 1996, с. 26); М. Янковяк, *Прафесар Яўхім Карскі– рэктар Імператарскага Варшаўскага універсітэта,* "Arche" 2010, № 4, с. 301–306.

[4] AP m. St. Warszawy, z. 645, k. 247–256, 261.

1908/1909 навучальнага года. Пра рашэнне Міністэрства народнай адукацыі паведаміў Я. Карскага апякун акругі ў лісце ад 16 мая 1908 г. тым часам, 6 верасня 1908 г. Рада Варшаўскага універсітэта абрала Карскага рэктарам на наступныя тры гады з мэтаю, як казаў пазней сам Я. Карскі, "усталявання прымальнага modus vivendi з палякамі (дадання 3-х польскіх кафедр), а не для абрусення іх"[5]. У 1909/10 навучальным годзе Я. Карскі чытаў граматыку старажытнай царкоўна-славянскай мовы студэнтам 1 і 2 курсаў славяна-рускага аддзялення, у 1910 г. – гісторыю рускай мовы студэнтам 3 курса гэтага аддзялення. Ён увёў новыя формы працы са студэнтамі – паездкі ў Пецярбург, Маскву, Кіеў; летнія курсы для настаўнікаў гарадскіх і пачатковых вучылішч, настаўнікаў грамадскіх навук і інш. У адпаведнасці з прашэннем Я.Ф. Карскага ад 6 верасня 1910 г. загадам ад 2 лістапада 1910 г. ён быў звольнены з пасады рэктара і ардынарнага прафесара. Трэба адзначыць, што ўсе пяць гадоў рэктарства Карскі падтрымліваў у Варшаўскім універсітэце беларускае зямляцтва[6].

Пра сваю дзейнасць на пасадзе рэктара Я. Карскі напісаў у маі 1926 г. у рэдакцыю газеты "Правда" у адказ на апублікаваны фельетон М.Е. Кальцова "И академик и герой" прысвечаны яго навуковай камандзіроўцы ў 1926 г. у Польшу, Чэхаславакію, Балгарыю і Югаславію[7].

Можна пагадзіцца з поглядам Т.Г. Бабковай, што "варшаўскі перыяд у дзейнасці Я.Ф. Карскага можна назваць адным з самых жыватворчых"[8]. За 12 гадоў Карскі дасягнуў творчай вышыні, займеў

[5] А.А. Карскі, *Ректор Императорского Варшавского университета* [в:] *Е.Ф. Карский и современное языкознание: материалы XII междунаодных научных чтений*, Гродно 2011, с. 16–28.

[6] В.И. Борковский, *Академик Е.Ф. Карский* (1861–1931), Ярославль 1945, с. 32.

[7] А.М. Решетов, *Из архива академика Е.Ф. Карского* [в:] *Курьер Петровской Кунсткамеры. Вып. 6–7*, СПб. 1997, с. 88–97.

[8] Т.Г. Бобкова, *Национально-культурное движение белоруссов в конце XX – начале XX стст.* [в:] Карский и современное языкознание: материалы XII междунар. науч. чтений, Гродно 2011, с. 38.

вопыт навукова-арганізацыйнай працы, дамогся прызнання навуковых заслуг Імператарскай Акадэміі навук.

Але трэба адзначыць, што ў варшаўскі перыяд сваёй дзейнасці Я.Ф. Карскі быў верным царскім падданым. У 1897 г. ён падпісаў віншавальную тэлеграму ў Вільню з нагоды ўсталявання там помніка былому літоўскаму генерал-губернатару М. Мураўёву – “вешальніку”[9]. У студзені 1905 г. Карскі не падпісаў маніфест (вядомы як “Запіска 342-х”), прафесараў за аўтаномію вышэйшых навучальных установаў у Расійскай імперыі, хоць пад ім ёсць подпісы 33 супрацоўнікаў Імператарскага Варшаўскага універсітэта. Такія паводзіны спрыялі яго кар’ернаму росту[10]. На рэктарскай пасадзе Я. Карскі быў праваднікам палітыкі адміністрацыі – Варшаўскай навуковай акругі і Міністэрства народнай адукацыі. Разам з тым ён не быў палонафобам, выказваўся за увядзенне ў навучальны працэс польскай мовы выкладання, але адначасова выступаў за закрыццё польскіх сярэдніх школ у адказ за антырасійскія выступленні.

## 2. Лёс варшаўскай бібліятэкі рэктара Карскага

У варшаўскі перыяд сфармавалася бібліятэка Я.Ф. Карскага, у склад якой уваходзілі кнігі, якія ён прывёз у Варшаву і з Вільні. З ліста Я. Карскага да В.І. Шэйна ад 25 лістапада 1893 г. можна даведацца, што “цяпер усё абзавожусь рознымі кнігамі”[11]. У канцы 1890-х Карскі ажыццяўляў збор кніг для палеаграфічных даследаванняў[12].

[9] J. Schiller, *Profesorowie Cesarskiego Uniwersytetu Warszawskiego wobec wydarzeń rewolucji 1905 roku* [w:] Nauka polska. Jej potrzeby, organizacja, rozwój, XVII (XLII), Warszawa 2008, s. 80.

[10] М. Янковяк, *Прафесар Яўхім Карскі – рэктар Імператарскага Варшаўскага універсітэта*.., s. 305.

[11] А.А. Карский, *Академик Карский,* Нёман, 2012, № 3, с. 136, 149.

[12] А. А. Карский, *Академик Карский*, Нёман, 2013, № 3, с.135.

## Эвакуацыя і здача бібліятэкі на дэпазыт

З пачатку Першай сусветнай вайны Варшаўскі універсітэт быў эвакуаваны ў Растоў-на-Доне. Сваю асабістую бібліятэку Карскі ў 1915 г. здаў у Бібліятэку Варшаўскага універсітэта (БВУ): 14 забітых скрынь і 2 звязаныя пакеты[13]. Пэўны час бібліятэка Карскага знаходзілася на яго кватэры па вул. Наталінска, 4. Аднак у 1916 г. нямецкія ўлады папрасілі вывезці кнігі Карскага з кватэры, што зрабіў працаўнік БВУ Зандровіч. У Архіве БВУ захавалася распіска насільшчыка за атрыманыя за перанос грошы[14].

У 1918 г. бібліятэка знаходзілася яшчэ ў БВУ. 17 мая 1918 г. кіраўнік БВУ пісаў у сакратарыят Універсітэта, што высылаў на кватэру былых прафесараў свайго працаўніка Зандровіча з мэтай забраць універсітэцкія кніжкі (насупраць тых, хто забраў свае рэчы ў 1918 г. стаяў крыжык – каля прозвішча Я.Карскага яго не было). Па сведчанню даследчыка А.М. Рэшатава 15 мая 1918 г. Карскі атрымаў у Расійскай акадэміі навук камандзіроўку ў Варшаву, Кіеў і Нежын для працы ў мясцовых бібліятэках да канца года[15]. Але ў гэты час Я. Карскі не забраў сваю бібліятэку. Дырэктар БВУ 8 кастрычніка 1918 г. пісаў Л. Беркуту, прафесару Універсітэта ў Растове, што “Праўленне БВУ просіць паведаміць былым прафесарам Варшаўскага Універсітэта, якія цяпер у Растоўскім універсітэце, што іх кнігі знаходзяцца на дэпазіце”. Сярод названых знаходзілася прозвішча Я. Карскага[16].

У 1919 г. бібліятэка ўсё яшчэ была ў БВУ, бо яе дырэктар пісаў у справаздачы, што “адзін з вялікіх збораў кніг – дэпазыт прафесара Карскага. Летам усе дэпазіты перанесены на калідор ніжніх

[13] Archiwum Biblioteki Uniwesytetu Warszawskiego (dalej: Archiwum BUW), zesp. VII/1a., k. 379.

[14] Archiwum BUW, zes. 8/VIII, k. 51; 10/VIII, k. 178; Arch. BUW, zes.VII/1a., k. 310.

[15] А.М. Решетов, *Евфимий Фёдорович Карский..*, с. 31

[16] Archiwum BUW, zes. 8/VIII, k. 16.

паверхаў склада"[17]. У 1919–1921 гг. Я. Карскі знаходзіўся ў Беларусі. У Мінску пры Губернскім камісарыяце народнай асветы ён быў старшынём камісіі па стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, напісаў праект яго арганізацыі, працаваў выкладчыкам на падрыхтоўчых курсах, арганізаваных камісіяй, і прафесарам Мінскага педагагічнага інстытута. Падчас акупацыі Беларусі польскімі войскамі ў 1919 г. камісія спыніла працу да ліпеня 1920 г. Вось у гэты час, у лістападзе 1919 г., як пісаў сам Карскі "будучы камандзіраваным Акадэміяй навук з навуковай мэтай на Украіну і Беларусь, якія былі тады пад акупацыяй, пабываў з дазволу нямецкіх улад у Варшаве і выявіў, што частка маёй маёмасці і кніжкі разрабаваны. Усяго мне была нанесена страта па тагачаснаму курсу германскай маркі на 36 815 марак, аб чым мной тады была выслана заява ў германскую камендатуру ў Варшаве, з дадаткам спісу разрабаваных рэчаў"[18]. Карскі забраў бібліятэку і напісаў 2 лістапада 1919 г. распіску, якая захавалася ў архіве БВУ, у якой чытаем: "Падцвярджаю, што атрымаў мае кнігі, якія Бібліятэка Варшаўскага Універсітэта прыняла на захаванне ў 1915 г. у 14 закрытых скрынях, пазначаных маім прозвішчам, а таксама у 2 звязаных пакетах"[19].

Летам 1920 г. Карскі наведаў брата Івана Навіцкага, які быў святаром Іаана Прадцечанскай царквы ў в. Блячын (цяпер в. Садовая Клецкага раёна). Даследчык А.У. Блінец, які піша пра гэта, спасылаецца на ўспаміны беларускага паэта і кампазітара С. Новіка-Пеюна, тады нясвіжскага гімназіста. Апошні пісаў, як Карскі падвёз яго па дарозе з Нясвіжа і размаўляў з ім пра гімназію, вёску і спевы дзяўчат[20]. У чэрвені 1920 г. Карскі апублікаваў вялікі этнаграфічны

---

[17] Archiwum BUW, zes. 14a/VIII, k. 197.

[18] Цыт. па: А.П. Цыхун, *Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф. Карскі (краязнаўча-біяграфічны нарыс),* Гродна 1992, с. 61.

[19] Archiwum BUW, zes. VIII/ 1a, k. 379.

[20] А.В. Блінец, *Новые сведения о родителях академика Е.Ф. Карскага* [в:] *Карский и современное языкознание: материалы XII междунар. науч. чтений*, Гродно 2011, с. 46–47.

артыкул “Культурныя узаемаадносіны народнасцяў Беларусі” у газеце “Утро”[21], дзе магчыма выкарыстаў і матэрыялы, якія пачуў ад Новікава-Пеюна. На пасяджэнні камісіі па стварэнню Беларускага дзяржаўнага універсітэта 11 жніўня 1920 г. ішла размова і пра арганізацыю ўніверсітэцкай бібліятэкі[22]. У жніўні 1920 г. Я.Ф. Карскага ўключылі ў Маскоўскую камісію па стварэнні БДУ, і ён назаўсёды пакінуў Беларусь.

## Месца знаходжанне бібліятэкі

У кастрычніку 1921 г. у лістах да мінскіх калог ён звяртаўся з просьбай аб укамплектаванні бібліятэкі БДУ яго ўласнымі кнігамі, якія ён вывез з Варшавы[23]. Даследчыца Л.Д. Сільнова знайшла ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь пратакол № 18 пасяджэння праўлення БДУ ад 25 мая 1922 г. з рашэннем аб набыцці бібліятэк Я. Карскага і І.П. Карнілава[24]. Фонды бібліятэкі БДУ пазней сталі адзінымі з Дзяржаўнай бібліятэкай БССР і ў хроніцы яе дзейнасці за чэрвень 1922 г. напісана: “Бібліятэка набыла кнігазбор па славянскай філалогіі і беларускай літаратуры і мове акадэміка Е.Ф. Карскага (4 000 тыс)”[25]. Пэўныя дэталі пра гэту падзею падае ў 1923 г. у артыкуле *Дзяржаўная і ўніверсітэцкая бібліятэка* празаік і драматург Язэп Дыла: “Летам 1922 г. у Дзяржаўную бібліятэку паступіла бібліятэка акадэміка Я. Карскага (больш за 4 000 тамоў).

[21] А.М. Решетов, *Евфимий Фёдорович Карский..*, с. 31–32.

[22] Л.И. Рублевская, В.В. Скалабан, *Время и бремя архивов и имён: очерки, эссе, пьеса,* Минск 2009, с. 45; *Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921 – 1941*, Мінск 2006, с. 13, 15, 48–54, 89.

[23] Д. Дзятко, *Яўхім Карскі: Бацька навуковага беларусазнаўства*, Мінск 2014, с. 50–51.

[24] Л.Д. Сільнова, *Калекцыя “Бібліятэка Я Карскага”: стан і перспектывы даследавання* [у:] *Здабыткі і дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 9*, Мінск 2007, с. 252.

[25] Н.Б. Ватацы, *Бібліятэка Я.Ф. Карскага* [у:]Літаратура і мастацтва. Т. 1, Мінск 1984, с. 422; Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 205, воп. 1, с. 38, л. 27.

У жніўні і верасні тав. Шыманоўскі (дырэктар бібліятэкі І.Б. Сіманоўскі), з’ездзіўшы ў Петраград і Маскву, прывозіць стуль папаўненне камплекту выданняў Акадэміі Навук і тое, што яшчэ было з бібліятэкі Карскага ў Петраградзе”[26].

У 1926 г. з бібліятэкі БДУ была вылучана асобная частка – Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна (цяпер Нацыянальная бібліятэка Беларусі). Тут апынуліся і кнігі з варшаўскай бібліятэкі Я. Карскага. Спачатку яны знаходзіліся ў аддзеле беларускай літаратуры, а пасля – у агульным кнігасховішчы бібліятэкі. На фарзацах кніг, у верхнім левым куце) рукою Я.Ф. Карскага напісаны нумар – лацінская літара N, перакрэсленая дзвюмя гарызантальнымі рыскамі і побач лічбы, пасля якіх абавязкова стаіць знак кропкі. У НББ кнігам была нададзена іншая нумарацыя: па алфавіце і па парадку.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваецца другі том “Каталога книгам библиотеки Карского”. Большасць даследчыкаў піша, што першы том знік у гады другой сусветнай вайны. Ёсць аднак падставы, каб меркаваць, што гэтае адбылося раней. Успомнім, што Я. Карскі забраў кнігі з БВУ ў лістападзе 1919 г. і скардзіўся на разрабаванне яго бібліятэкі падчас нямецкай акупацыі. Другі том каталога – гэта бухгалтарская кніга са “складу папер” варшаўскага выдаўцы Станіслава Вінярскага памерам 35х25 см. Даследчыца Л.Д. Сільнова выказала здагадку, што каталог пісаўся ў 1915 г. перад эвакуацыяй Карскага з Варшавы. Падаецца, што гэта не так, бо перад намі сапраўды каталог, а не спіс літаратуры, пакінутай у дэпазыт БВУ. Да таго ж, ён напісаны рукой Я. Карскага ў храналагічнай паслядоўнасці, а не абыяк у паспеху ваеннага часу (4 сакавіка 1915 г. расійская ўлада ў Варшаве абвясціла аб налётах нямецкіх аэрапланаў, а 5 жніўня расійская армія пакінула горад[27].

---

[26] Цыт. па: Л.Г. Кирюхина, *Коллекции учёных славяноведов в фондах Национальной библиотеки Беларуси,* [у:] *Информационный бюлетень Библиотечной Ассамблеи Евразии, Вып. 12*, 2000, с. 1.

[27] *Historia Polski. Kalendarium dziejów. T. III. 1887–1943*, red.: A. Nowak, Kraków 2017, s. 88, 93.

Другі том каталога пачынаецца з № 1663 (с. 139 канторскай кнігі і заканчваецца № 3078 (с. 222). Такім чынам, ён налічвае 1415 найменняў, апублікаваных у асноўным у канцы XIX – пачатку XX ст., але ёсць і старадрукі. Напрыклад, пад № БК 2300 запісаны Псалтыр 1757 г. выдання знакамітай Магілёўскай Богаяўленскай друкарні. Напэўна, ён быў патрэбны Я. Карскаму падчас напісання доктарскай дысертацыі. Некаторыя кнігі былі пераплецены і складалі канвалюты з розных кніг тэматычна звязаных. Напрыклад, *Сборник статей по истории руской словесности*. (Т. 3, 1893 г.) змяшчае 10 розных кніг і артыкулаў: *Иностранная критика о Тургеневе* (СПб., 1884), *Шесть статей о Пушкине* А.І. Незялёнага (СПб., 1884), *Сжатый обзор истории новой русской литературы с библиографическими примечаниями* П.А. Віскаватага (Дерпт, 1892) і інш.

Па пералічаных у каталозе кнігах бачна, што бібліятэка Я.Ф. Карскага – гэта бібліятэка вучонага-філолага. Большасць яе складаюць кнігі па славяназнаўстве, этнаграфіі, мовазнаўстве, літаратуразнаўстве. Сярод іх працы А.А. Шахматава, А.І. Сабалеўскага, К.Я. Грота, Ю. Полівкі, М.М. Дурнаво, Ф.І. Буслаева, Б.М. Ляпунова, А.С. Арлова, А.А. Васілеўскага, У.М. Пераца і іншых. Шмат апублікаваных зборнікаў дакументаў і матэрыялаў. Такіх, як: *Акты издаваемые Виленской археографическою комиссией: Гродненского земского суда* (1539–1565 гг.). Т. 17. – Вильна, 1890; *Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси* (1867); *Документы, объясняющие историю Западнорусского края в его отношении к России и к Польше* (СПб., 1865); *Сборник документов, касающихся административного устройства Северо-Западного края при императрице Катерине II* (Вильна, 1905); *Историко-юридические материалы, извлечённые из актов книг губерний Витебской и Могилёвской и изданные под редакцией Дм. и Ив. Довгялло* (Витебск, 1906); *Русская историческая библиотека, издаваемая Императорской Археографическою комиссиею. Памятники полемической литературы в Западной Руси.* Т. 19. Кн. 3 (Пб., 1903) і іншыя.

Сярод кніг Я. Карскага былі кнігі і на беларускай мове: *Аб чым у нас цяпер гамоняць* (Вільня, 1896); *Гутаркі аб гаспадарцы* Сempалоўскага (Вільня, 1909); *Гутарка аб небе і зямлі* (СПб., 1907); *Цукер: З гутарак з дзядзькам Сымонам* В. Тройцы (Вільня, 1908); Жалейка Я. Купалы (СПБ., 1908); *Вечарніцы* В. Дуніна-Марцінкевіча (СПБ, 1900); *Песні жальбы* Я. Коласа (Вільня, 1910); *Кароткая гісторыя Беларусі* Власта (В. Ластоўскага); камплекты газеты "Наша Ніва" і яе беларускія календары. На рускай мове былі кнігі беларусаў па паходжанню: Е.Р. Раманава *Беларускія народныя мелодыі* (Вільня, 1910); і пад яго рэдакцыяй *Матэрыялы па этнаграфіі Гродзенскай губерні* (Вільня, вып. 1–2, 1911–1912); М.І. Нікіфараўскага *Беларускія песні-частушкі*; А.К. Сержпутоўскага *Байкі і рассказы беларусаў-палешукоў* (СПб., 1911).

Сёння бібліятэка Я.Ф. Карскага захоўваецца ў сховішчы навукова-даследчага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Каштоўныя адзінкі захоўваюцца ўсе разам у спецыяльна створаных умовах (тэмпература каля +18, штучнае пылавыдаленне і вентыляцыя, зацямненне ад прамых сонечных промняў). Усе адзінкі маюць карткі з бібліяграфічным апісаннем (службовы тапаграфічны каталаг БК)[28]. Для карыстання маюцца дзве картатэкі даведачнага характара: у адной апісаны кнігі з аўтографамі асоб, якія даслалі свае кнігі Карскаму; у другой пералічаны аўтары аўтографаў з кароткімі біяграмамі. Цяпер яны ёсць у электронным варыянце.

Кніг з аўтографамі ў бібліятэцы Я. Карскага было звыш 600 экзэмпляраў[29]. Найперш даравалі кнігі калегі філолагі-мовазнаўцы, якія падтрымлівалі з ім навуковыя кантакты: прафесар Кіеўскага, пазней Пецярбургскага універсітэтаў (з 1900 г. акадэмік) А.І. Сабалеўскі; прафесар Маскоўскага археалагічнага Інстытута Р.Ф. Брандт; мовазнавец і гісторык старажытнай рускай культуры

[28] Л.Д. Сільнова, *Калекцыя "Бібліятэка Я Карскага"..*, с. 254–257.
[29] Ibidem, с. 260.

А.А. Шахматаў; мовазнавец Д.М. Ушакоў (будучы складальнік *Толкового словаря русского языка*) і іншыя.

У часцы кніг знаходзім аўтографы этнографаў, фальклярыстаў, гісторыкаў старажытнай літаратуры, літаратуразнаўцаў: прафесараў Варшаўскага універсітэта А.Д. Грыгор'ева і І.І Замоціна; будучага акадэміка АН УССР А.М. Лабады; даследчыка рускага эпаса У.Ф.Міллера; збіральніка народнай творчасці П.У. Шэйн; этнографа Э.Э. Вальтэра і інш. Атрыманы кнігі з аўтографамі і ад гісторыкаў: Б.Д. Грэкава, А.Л. Пагодзіна, П.Д. Бранцава, М.М. Любовіча, Я.Ф. Арлоўскага і інш.

## Заключэнне

У адказе фельетаністу Міхаілу Кальцову, Я.Ф. Карскі напісаў: "я прыродны беларус, усё сваё жыццё прысвяціўшы беларускай этнаграфіі, мове і літаратуры; што ўся цяперашняя беларуская інтэлігенцыя выхоўвалася на маіх працах (аб чым гл. хаця б у М. Гарэцкага "Гісторыя беларускае літаратуры", вып. 4, Менск, 1926 г., стр. 147) і што ўсе прыгнечаныя беларусы, пачынаючы ад вядомага беларускага этнографа К.Р. Раманава, памёршага ад голаду ў Стаўрапалі Каўказскім, звяртаюцца да мяне за духоўнай падтрымкай"[30].

У Варшаве ёсць чатыры адрасы, дзе жыў Я.Ф. Карскі са сваёй сям'ёй. Усе яны знаходзяцца недалёка ад галоўнага кампуса і старой бібліятэкі Варшаўскага універсітэта. З 1893 г. Карскія жылі на вул. Сеннай, 8, з 1895 г. – на вул. Вспульнай, 24 (Кручай, 35). З верасня 1899 г. сям'я Карскіх пераехала на вул. Пенкную, 39[31]. Яшчэ адзін адрас гэта вул. Наталінска, 4, кв. 12, дзе засталіся рэчы і бібліятэка Я. Карскага ў 1915 г.[32].

[30] А.М. Решетов, *Из архива академика Е.Ф. Карского..*, с. 97. Тое ж гл.: Л.И. Рублевская, В.В.Скалабан, *Время и бремя архивов и имён..*, с. 48.

[31] Карский А.А., *Академик Карский* [у:] Нёман. – 2012. – № 3. – С. 136, 156; Нёман. – 2013. – № 3. – С.135.

[32] Archiwum BUW, zes. 8/ VIII, k. 33.

На малой радзіме Я.Ф. Карскага гродзенцы памятаюць свайго знакамітага земляка. У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце з 1990 г. праводзяцца міжнародныя навуковыя чытанні "Я.Ф. Карскі і сучаснае мовазнаўства". Тым часам, у гімназіі № 1 імя Я.Ф. Карскага працуе з 1995 г. музей Я.Ф. Карскага. Варта таксама ўзгадаць, што сябры гродзенскага Таварыства беларускай мовы распрацавалі турыстычны маршрут "Прынёманскімі шляхамі Карскага"[33].

## Бібліяграфія

### Архіўныя крыніцы

Archiwum Biblioteki Uniwesytetu Warszawskiego, zesp. VII/1a., k. 310, 379; zes. 8/VIII, k. 16, 51; zes. 10/VIII, k. 178; 14/VIII, k. 197.

Archiwum Państwowy M. St. Warszawy, z. 645, k. 7, 10 адв., 104, 114, 129, 159, 169, 247–256, 261.

Natsyyanal'ny arkhiu Respubliki Byelarus', f. 205, vop. 1, s.38, l. 27 [Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 205, воп. 1, с. 38, л. 27.]

### Літаратура

Blinets A.V., *Novyye svedeniya o roditelyakh akademika Ye.F. Karskaga* [v:] *Karskiy i sovremennoye yazykoznaniya,* Grodno 2011 [Блинец А.В., *Новые сведения о родителях академика Е.Ф. Карскага* [в:] *Карский и современное языкознание: материалы XII междунар. науч. чтений*, Гродно 2011].

Bobkova T.G., *Natsional'no-kul'turnoye dvizheniye belorussov v kontse XX – nachale XXI·st.* [v:] *Karskiy i sovremennoye yazykoznaniye: materialy XII mezhdunar. nauch. chteniy*, Grodno 2011 [Бобкова Т.Г., *Национально-культурное движение белоруссов в конце XX – начале XXI стст.* [в:] *Карский и современное языкознание: материалы XII междунар. науч. чтений*, Гродно 2011].

Borkovskiy V.I, *Akademik Ye.F. Karskiy (1861–1931)*, Yaroslavl' 1945 [Борковский В.И, *Академик Е.Ф. Карский* (1861–1931), Ярославль 1945].

---

[33] М.І. Канюшкевіч, *Міжнародныя навуковыя чытанні "Я.Ф. Карскі і сучаснае мовазнаўства": гісторыя, роля, водгулле* [ў:] Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў, Гродна 2013, Вып. 2, с. 124–131; В.Р. Карнялюк, *Да гісторыі музея Я.Ф. Карскага ў гімназіі №1 імя акадэміка Я.Ф. Карскага г. Гродна: лашанскі перыяд(1956–1991 гг.)* [ў:] Там сама, с. 139–148; Крой А.І., *Шляхамі акадэміка Карскага* [ў:] Там сама, с. 162–181.

Bulakhov M.G., Yevfimiy Karskiy, *Zhizn', nauchnaya i obshchestvennaya deyatel'nost'*, Minsk 1981 [Булахов М.Г., *Евфимий Карский. Жизнь, научная и общественная деятельность,* Минск 1981].

Vatatsy N.B., *Bibliyateka Ya.F. Karskaha* „Litaratura i mastatstva" 1984, nr 1 [Ватачы Н.Б., *Бібліятэка Я.Ф. Карскага*, "Літаратура і мастацтва" 1984, №. 1].

Dzyatko D., Yawkhim Karski: Bats'Ka navukovaha byelarusaznawstva, Minsk 2014 [Дзятко Д., *Яўхім Карскі: Бацька навуковага беларусазнаўства*, Мінск 2014].

Kanyushkyevich M.I, *Mizhnarodnyya navukovyya chytanni "Ya.F. Karski i suchasnaye movaznawstva":historyya, rolya, vodhullye* [w:] *Haradzyenskiya chytanni: zb. materyyalaw*, Hrodna 2013, Vyp. 2 [M.I. Канюшкевіч, *Міжнародныя навуковыя чытанні "Я.Ф. Карскі і сучаснае мовазнаўства": гісторыя, роля, водгулле* [ў:] Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў, Гродна 2013, Вып. 2].

Karnyalyuk V.R., *Da historyi muzyeya Ya.F. Karskaha w himnazii №1 imya akademika Ya.F. Karskaha h. Hrodna: lashanski pyeryyad(1956–1991 hh.)* [v:] *Haradzyenskiya chytanni: zb.materyyalaw*, Hrodna 2013, Vyp. 2 [Карнялюк В.Р., *Да гісторыі музея Я.Ф. Карскага ў гімназіі №1 імя акадэміка Я.Ф. Карскага г. Гродна: лашанскі перыяд (1956–1991 гг.)* [ў:] *Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў*, Гродна 2013, Вып. 2].

Karskiy A.A., *Akademik Karskiy,* "Nëman", 2012, № 3; 2013, № 3 [Карский А.А., *Академик Карский,* "Нёман", 2012, № 3; 2013, № 3].

Karskiy A.A., Rektor *Imperatorskogo Varshavskogo universiteta* [v:] *Ye.F. Karskiy i sovremennoye yazykoznaniye: materialy XII mezhdunaodnykh nauchnykh chteniy*, Grodno 2011 [Карский А.А., *Ректор Императорского Варшавского университета* [в:] *Е.Ф. Карский и современное языкознание: материалы XII междунаодных научных чтений*, Гродно 2011].

Kiryukhina L.G., *Kollektsiiuchënykh slavyanovedov v fondakh Natsional'noy biblioteki Belarusi* [u:] *Informatsionnyy byuleten' Bibliotechnoy Assamblei Yevrazii, Vyp. 12*, 2000 [Кирюхина Л.Г., *Коллекции учёных славяноведов в фондах Национальной библиотеки Беларуси,* [у:] *Информационный бюлетень Библиотечной Ассамблеи Евразии, Вып. 12*, 2000].

Kroy A.I., *Shlyakhami akademika Karskaha* [v:] *Haradzyenskiya chytanni: zb. materyyalaw*, Hrodna 2013, Vyp. [Крой А.І., *Шляхамі акадэміка Карскага* [ў:] *Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў*, Гродна 2013, Вып. 2].

*Patyats' i slava: Byelaruski dzyarzhawny univyersitet. 1921–1941*, Minsk 2006 [*Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны універсітэт. 1921–1941*, Мінск 2006].

Reshetov A.M., *Yevfimiy Fëdorovich Karskiy* [v:] *Kur'yer Petrovskoy Kunstkamery, Vyp. 4–5*, Petersburg 1996; Vyp. 6–7, SPB. 1997 [Решетов А.М., *Евфимий*

*Фёдорович Карский* [в:] *Курьер Петровской Кунсткамеры, Вып. 4–5*, СПб. 1996; Вып. 6–7, СПб. 1997].

Rublevskaya L.I., Skalaban V.V., *Vremya i bremya arkhivov i imën: ocherki, esse, p'yesa*, Minsk 2009 [Рублевская Л.И., Скалабан В.В., *Время и бремя архивов и имён: очерки, эссе, пьеса,* Минск 2009].

Sil'Nova L.D., *Kalyektsyya"Bibliyateka Ya Karskaha": stan i pyerspyektyvy daslyedavannya* [u:] *Zdabytki i dakumyental'nyya pomniki na Byelarusi. Vyp. 9*, Minsk 2007 [Сільнова Л.Д., *Калекцыя "Бібліятэка Я Карскага": стан і перспектывы даследавання* [у:] *Здабыткі і дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 9*, Мінск 2007].

Tsykhun A.P., *Akademik z vyoski Lasha Ya.F. Karski (krayaznawcha-biyahrafichny narys),* Hrodna 1992 [Цыхун А.П., *Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф. Карскі (краязнаўча-біяграфічны нарыс),* Гродна 1992, с. 61].

Yankovyak M., *Prafyesar Yawkhim Karski– rektar Impyeratarskaha Varshawskaha univyersiteta*, "Arche" 2010, №4 [Янковяк М., *Прафесар Яўхім Карскі– рэктар Імператарскага Варшаўскага універсітэта,* "Arche" 2010, № 4].

*Historia Polski. Kalendarium dziejów. T. III. 1887–1943*, red.: A. Nowak, Kraków 2017, s. 88, 93.

Schiller J., *Profesorowie Cesarskiego Uniwersytetu Warszawskiego wobec wydarzeń rewolucji 1905 roku* [w:] *Nauka polska. Jej potrzeby, organizacja, rozwój, XVII (XLII),* Warszawa 2008.

## Warsaw during the life of Professor J.F. Karsky and the fate of his library

In the first part of the article, the author tells about the Warsaw period of Karsky's life: his teaching, scientific and social activities. The second part of the article is devoted to the fate of the Warsaw library. The author writes about putting the library of Karsky in the deposit of the Library of the Warsaw University, finds out when it was collected from there when it was transferred to the Belarusian State University, where it is located present tense In the story about the catalog of Karsky's books, the author suggests that he was compiled during the Warsaw period of Karski's life and activity, that his first part was lost during the German occupation of Warsaw during the First World War. There are indications of what kind of books were in the library and the presence of autographs in the books.

Keywords: the Warsaw library of Karsky, deposit Library of the Warsaw University, the Belarusian State University, catalog of books,autographs in the books.